# Трансфармацыя функцый мастацтва ў сучасным свеце

**Аўчыннікаў Дзмітры Ігаравіч,** студэнт Новасыбірскага дзяржаўнага педагагічнага універсітэту

Мастацтва як від творчай дзейнасці чалавека здаўна займала асаблівае месца ў ягоным жыцці. Менавіта з дапамогай мастацтва як сродка адлюстравання рэчаіснасці ён пазнаваў навакольны свет, развіваў сваю свядомасць, а таксама перадаваў свае веды наступным пакаленням – першапачаткова ў выяўленчай форме, а затым, са з’яўленнем пісьмовасці, і ў выглядзе апісанняў. Вядома, што мастацтва нарадзілась ў глыбокай старажытнасці, і прычынай ягонага ўзнікнення было імкненне людзей да арганізацыі свайго працоўнага досведу у славесных ды іншых знакавых, сымбалічных формах.[1] З цягам часу няспынна ўдасканальвалісь сродкі, мэтады стварэння мастацкіх твораў, узнікалі новыя тэхналёгіі і нават новыя віды мастацтва. Гэта было звязана з агульным развіццём чалавечай цывілізацыі, прагрэсам навукі ды тэхнікі. Але нязменным заставалась сутнасць мастацтва, яго галоўнае прызначэнне – эмацыйнае ўздзеянне на чалавека з мэтай выклікаць адпаведную рэакцыю.

Па сваёй сутнасці мастацтва мае эстэтычны характар. Эстэтычнасць – гэта здольнасць абудзіць пачуццё хараства, прынесці мастацкую асалоду. Яна з’ўляецца неад’емнай ўласцівасцю мастацтва, ягоным сутнасным зярном. Бо ягоная галоўная задача – выклікаць у чалавека зацікаўленую эмацыйна-асабовую рэакцыю, закрануць ягоную душу. Мастацкія творы нельга успрымаць спакойна, холадна, выключна на свядома-рацыянальным узроўні. Іх адметная рыса палягае ў тым, што яны ўздзейнічаюць на пачуццёвую сферу чалавечай свядомасці, ў іх прэвалюе не аб’ектыўны, а суб’ектыўны бок. Ніводны мастацкі твор ня мае адназначнай інтэрпрэтацыі, ён ня месціць ў сябе абсалютную ісціну. Кожны чалавек, у адпаведнасці са сваім жыццевым досведам, ступенью эмацыйнай ўспрымальнасці бачыць ў тым ці іншым творы нешта сваё, магчыма нават тое, што не закладалась першапачаткова ягоным стваральнікам.

Звычайна ў мастацтвазнаўскай літаратуры выдзяляюць некалькі першасных функцый мастацтва. Апроч ўласна эстэтычнай, гэта пазнавальная, ацэначная ды функцыя самавыражэння. Асаблівае значэнне мастацкай функцыі тлумачыцца тым, што без яе немагчыма выкананне іншых функцый, якія таксама, кожная па-свойму, адыгрываюць вельмі важную ролю.

Мастацтва заўсёды гуляла ролю важнай сацыяльнай з’явы, было ня толькі відам дзейнасці асобных людзей, адарваным ад штодзённага жыцця мільёнаў шэраговых людзей, але непасрэдна датычылась гэтага жыцця, ўплывала на яго. Мастацтва, ў прыватнасці ды найперш літаратура, ня толькі адлюстроўвала навакольную рэчаіснасць, чутка улаўліваючы актуальныя тэндэнцыі грамадзкага жыцця, але і сама стварала павестку дня, фармавала свядомасць людзей, скіроўваючы іх думкі ў той ці іншы бок. Клясычны прыклад гэтага – вялікая расейская літаратура XIX стагоддзя. У той час выбітныя расейскія пісьменнікі былі сапраўднымі ўладальнікамі дум грамадства, найперш моладзі, якая вучылась на гэтых творах, з іх пазнавала жыццё, брала прыклады для падражання у асобе розных літаратурных герояў.

У той жа час, вялікае сацыяльнае значэнне мастацтва абумоўлівала ягоную выкрывальніцкую сілу. На эта звяртаў увагу М.Г.Чарнышэўскі, які пісаў, што «мастацкія творы могуць мець значэнне прысуду з’явам жыцця».[2] У значнай ступені гэтая тэза была адлюстраваннем поглядаў т.зв. рэалістычнага напрамку у літаратуры, прадстаўнікі якога лічылі, што мастацтва, апроч сваёй эстэтычнай сутнасці, мусіць служыць пэўным утылітарным мэтам, несці у сабе нейкі ідэалягічны пасыл, рэагаваць на з’явы жыцця, выкрываць заганы навакольнай рэчаіснасці. М.Горкі адзначаў, што «мастацтва ставіць сваёй мэтай перабольшваць добрае, каб яно стала яшчэ лепей,

перабольшваць кепскае, каб яно выклікала агіду». То бок мастацтва тут бачыцца сваеасаблівай лупай, якая, быццам сонечные прамені, ўбірае у сябе, акумулюе сацыяльную энэргію, прадстаўляе рэчаісныя факты жыцця у перабольшаным, нават гіпертрафічным выглядзе, каб яскравей данесці да спажыўца мастацкага твору тую ці іншую мастацкую задуму. Яна можа палягаць у тым, каб выклікаць у чалавека станоўчыя пачуцці, замілаванне хараством прыроды або чалавечых постацей, а можа наадварот, ставіць сваёй мэтай дамагчысь непрыязненнага стаўлення, пачуцця абурэння ды агіды. Наколькі гэтыя мэты будуць выкананыя, залежыць ад майстэрства творцы, трапнасці ды таленавітасці ужытых ім мэтадаў ўздзеяння. Бо, як пісаў той жа Горкі, «гераічная справа патрабуе гераічнага слова».[3] І калі пісьменнік ня здолее знайсці найбольш яскравыя ды захапляльныя мастацкія сродкі для выражэння сваёй думкі, яна ня атрымае водгуку ў сэрцы чытача, нават калі ў творы былі ўзнятыя нейкія цікавыя ды надзённыя тэмы.

Але ўсё гэта збольшага засталось ў мінулым, страціла актуальнасць ў нашых сённяшніх варунках. Сёння можна канстатаваць, што мастацтва страціла большасць сваіх былых функцый, ды увогуле змянілась ягоная роля ў грамадзкім жыцці. Можна выдзеліць некалькі ўзаемазвязаных чыннікаў, якія апасродкуюць падобны стан справаў:

1) істотнае паскарэнне тэмпу жыцця, у звязку з чым у сучаснага чалавека проста няма часу на успрыняццё сур'ёзнага мастацтва, рэфлексію над вечнымі пытаннямі быцця; ён аддае перавагу забаўляльным спосабам марнавання часу, шукае лёгкіх задавальненняў, хуткаплынных, негрунтоўных ўражанняў;

2) агульная камерцыялізацыя амаль ўсіх сфэраў нашага сучаснага жыцця, што вельмі згубна адбілась на мастацтве, якое таксама ператварылась на звычайны рынкавы тавар, жыве паводле жорсткіх рынкавых законаў.

Апошні чыннік прывёў да выцяснення, напрыклад, сапраўнай літаратуры белетрыстыкай, якая валодае вельмі нізкімі мастацкімі якасцямі, але цалкам адпавядае патрэбам рынку, карыстуецца вялізным попытам. У выніку, зараз бадай немагчыма натрапіць на высокаякасны мастацкі твор, які задавальняе ўсім галоўным крытэрам сапраўднанга мастацтва. Такія творы сёння збольшага un heureux hazard, выключэнне з правіл, адхіленне ад сучаснай нормы.

Нельга не звярнуць увагу на яшчэ адзін, хіба не самы важны чыннік. Справа у тым, што за апошнія гады адбывалася вельмі істотная, нават рэвалюцыйная падзея – змяніўся спосаб успрыняцця чалавекам навакольнай рэчаіснасці. Калі раней слова было асноўным носьбітам інфармацыі, на падставе якой у чалавека удавалась карціна свету, то сёння яго месца заняў вобраз. Кажучы па-навуковаму, сёння мы назіраем перавагу візуальнага ряду над вэрбальным.[4] У сучаснага чалавека ужо сфармавалась кліпавае мысленне, што асабліва яскрава бачна у маладога пакалення, якое атрымлівае пераважную большасць інфармацыі з тэлевізара ды інтэрнэта, у той час як раней галоўнымі крыніцамі інфармацыі былі кнігі ды газеты.

Падсумоўвуючы, можна сказаць, што сёння функцыі мастацтва звялісь да забаўлення ды эмацыйнай разрадкі чалавека, які ў штодзённым жыцці пeражывае вельмі моцныя эмацыйныя перагрузкі. Умовы жыцця, якія змяняюцца, патрабуюць змены спосабаў ажыццяўлення мастацкай дзейнасці, пошуку новых формаў уздзеяння на людзей. Таму сёння мастацтва занятае ня столькі адукацыйнымі ды асветніцкімі праблемамі, колькі пытаннем пошуку найбольш эфектыўных формаў свайго існавання. Магчыма, вырашыўшы гэтую экзістэнцыйную задачу, яно урэшце вернецца да сваіх зыходных функцый. Прынамсі, застаецца толькі спадзявацца на гэта.

Спіс літаратуры

1.Горкий М. Об искусстве – выступление на Первом Всесоюзном съезде срветских писателей 1934 г.

2.Есин А.Б. Принципы и приёмы анализа литературного произведения. – М., 2013

3.Шкраба Р.В. Беларуская савецкая літаратура. – Мінск, 1981

4.Марцинклвская Т.Д. Искусство в современном мире – новые формы и новые старые механизмы воздействия / Культурно-историческая психология. – 2007, №2